View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# ГЕНЕРАЛ А.У. СТАНКЕВІЧ – ЯГО ВАЕННЫ ЛЁС

Ю.А. Цераховіч, г. Мінск

Л.Л. Шкуцько, г. Мінск

Антон Уладзіміравіч Станкевіч нарадзіўся ў небагатай дваранскай сям'і ў маёнтку Губіна сучаснага Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Пасля атрымання хатняй адукацыі паступіў у Віленскае пяхотнае юнкерскае вучылішча, пасля заканчэння якога атрымаў першае афіцэрскае званне прапаршчыка (1880 г.). Праз некалькі год А.У. Станкевіч паспяхова скончыў афіцэрскую стралковую школу. З гэтага ж года пачалася яго нялёгкая афіцэрская служба ў расійскім войску. Ён прайшоў усе ступені баявога пяхотнага афіцэра: ад камандзіра роты да камандзіра брыгады 62 пяхотнай дывізіі, ад прапаршчыка да генерал-маёра. Усяго службе ў царскай арміі ён аддаў 40 год свайго жыцця.

У перыяд першай сусветнай вайны А.У. Станкевіч камандаваў 329 пяхотным Бузулукскім палком, брыгадай 62 пяхотнай дывізіі. У 1917 г. быў прызначаны камандзірам дывізіі і за шэраг перамог здабытых у баях з кайзераўскімі войскамі атрымаў званне генерал-маёра [1, с. 141]. У 1915 г. за ўмелае камандаванне палком і брыгадай, за арганізацыю пераправы кіруемым ім 90-ым пяхотным Анежскім палком і авалоданне некалькімі населенымі пунктамі, а таксама за асабісты гераізм, праяўлены ў баях, ён быў узнагароджаны Георгіеўскай ганаровай зброяй, а ўсяго за гады службы ў царскай арміі А.У. Станкевіч атрымаў ордэны Святога Станіслава II ст., Святой Анны II ст., Святога Уладзіміра IV ст. і іншыя ўзнагароды [2].

У 1918 г. А.У. Станкевіч рэзка мяняе свой ваенны лёс і дабраахвотна ўступае ў рады Чырвонай Арміі. Вясной 1919 г. загадам Рэўваенсавета краіны ён прызначаецца камандзірам 42 стралковай дывізіі, якая вяла цяжкія баі на Данбасе ў раёне Дзебальцава. Чырвонаармейцы спачатку насцярожана сустрэлі новага камандзіра, але асабістай адвагай, ваенным майстэрствам, адданасцю рэвалюцыі ён паступова заваёўвае аўтарытэт і павагу ў радавых байцоў і камандзіраў [3, с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

76]. Праз некаторы час яго прызначаюць памочнікам камандуючага 13 арміі. Адначасова ён з'яўляўся камандзірам Ніжнедзевіцкага атрада левай групы войск Стараaскольскага накірунку. З пачатку кастрычніка 1919 г. А.У. Станкевіч зацвярджаецца часова выконваючым абавязкі начальніка 55 стралковай дывізіі, якая вяла баі пад Арлом. У час аднаго з жорсткіх баёў 13 кастрычніка 1919 г. у раёне сяла Залатарова ў выніку здрады начальніка штаба 55 дывізіі падпалкоўніка А.А. Лаўрыца, А.У. Станкевіч з групай камсастава штаба быў узяты ў палон белагвардзейцамі. Усе супрацоўнікі штаба былі растраляны, а А.У. Станкевіч адпраўлены на допыт.

У час допытаў над генералам страшэнна здзекваліся. Яму неаднаразова прапаноўвалі перайсці на службу да А. Дзянікіна, але ўсе прапановы аб пераходзе ім былі адхілены. Не дабіўшыся вынікаў, А.У. Станкевіча перадалі ваенна-палявому суду, дзе згодна з загадам А. Дзянікіна аб тым што "Всех, кто не оставит безотлагательно ряды Красной армии, ждет полевой суд Русской армии – суровый и беспощадный" [4, с. 252], яго прыгаварылі не да растрэлу як баявога генерала, а да павешання. На павешанне генерала сагналі жыхароў навакольных вёсак. Пасля абвяшчэння прыгавору А.У. Станкевіч адхіліў казака-палача і сам накінуў вяровачную пятлю сабе на шыю. Усё гэта адбылося на вачах у яго дачкі, якая тайна знаходзілася ў людскім натоўпе.

Павесілі генерала ў чырвонаармейскім абмундзіраванні, якое было пазней знята і ён у адной бялізне вісеў на віселіцы, больш двух сутак. Але і на гэтым здзекі не спыніліся. Перад тым, як абрэзаць вяроўку, пад яго віселіцу паклалі барану з жалезнымі зуб'ямі. Пасля ўсяго на грудзях генерала была выразана зорка, а труп выкінуты ў яр.

Згодна з пастановай Рэўваенсавета РСФСР у лістападзе 1919 г., пасля разгрому дзянікінскіх войск пад Арлом, цела 62-летняга генерала было перавезена ў Маскву і пахавана 11 лістапада 1919 г. на Чырвонай плошчы каля Крамлёўскай сцяны. Загадам Рэўваенсавета рэспублікі А.У. Станкевіча за баявыя заслугі і гераізм быў узнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На станцыі Залатарова, дзе генерал быў узяты ў палон устаноўлены памятны знак (невялікі металічны абеліск, увенчаны пяціканцовай зоркай) з надпісам: «Здесь, на станции Золотарево, в октябре 1919 года геройски погиб, казненный белогвардейцами красный генерал Антон Владимирович Станкевич. 1862-1919» [5, с. 321]. Імя баявога генерала А.У. Станкевіча прысвоена адной з вуліц г. Паставы.

Сёння складана ацаніць, што кіравала дзеяннямі генерала, які 40 год праслужыў царскаму рэжыму, пры пераходзе на службу ў Чырвоную Армію, дзе ён таксама выяваў мужна і самаахвярна. Пры гэтым перад немінуючай смерцю ўсе прапановы, якія зберагл і б жыццё былі ім адхілены. Лёс баявога генерала – наглядная ілюстрацыя сутнасці Грамадзянскай вайны. Трэба зазначыць, што брат А.У. Станкевіча таксама генерал С.Л. Станкевіч у час баявых дзеянняў у раёне Данецкага басейна камандаваў дывізіяй Дабраахвотніцкай арміі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура і крыніцы

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пастаўскага раёна / Рэдкал. Г.К. Кісялёў [і інш.]. – Мн.: БЕЛТА, 2001. — 688 с.

2. Русская армия в Великой войне / Картотека проекта / С / Станкевич Антон Владимирович [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: http://www.grwar.ru/persons/persons.htmlid=1871. – Дата доступу: 18.02.2014.

3. Абрамов, А.С. У Кремлевской стены / А.С. Абрамов. – М.: Политиздат, 1974. – 311 с.

4. Лехович, Д.И. Белые против красных. Судьба генерала Антона Деникина / Д.И. Лехович. — М.: ”Воскресенье”, 1992. – 368 с.

5. Катанов, В.М. Однажды в Орле / В.М. Катанов. — Орел: «Вешние Воды», 1993. – 497 с.